# РЕЦЭНЗІЯ
## на манаграфію В.Ф.Капыціна "Археологические памятники Кричевского района Могилёвской области". Могилёв, 1999

Археалагічная экспедыцыя МГУ імя А.А.Куляшова пад кіраўніцтвам В.Ф.Капыціна на працягу некалькіх дзясяцігоддзяў займаецца вывучэннем помнікаў археалогіі Магілёўскай вобласці. У выніку шматгадовай працы сабраны вялікі матэрыял, які дазволіў картаграфаваць і сістэматызаваць помнікі археалогіі Магілёўшчыны і пачаць працу па выданню каталагаў, прысвечаную старажытнасцям розных адміністрацыйных адзінак Магілёўскай вобласці.

Убачыўшая свет манаграфія В.Ф.Капыціна "Археологические памятники Кричевского района Могилёвской области" з'яўляецца лагічным працягам шматгадовай і плённай працы даследчыка па пошуках, вывучэнню і ахове помнікаў археалогіі Магілёўшчыны.

Знаёмства са зместам невялікай па аб'ёме манаграфіі адразу ж паказвае, што чытач знойдзе тут адказ на шматлікія пытанні, якія тычацца старажытнай гісторыі Крычаўшчыны.

Сваё апавяданне аб старажытнай гісторыі Крычаўскага раёна аўтар пачынае са знаёмства з фізіка-геаграфічнымі характарыстыкамі даследуемага раёна і з агульнымі паняццямі аб археалогіі і помніках, якія яна вывучае. Гэта адразу ж знаёміць чытача з праблематыкай і спецыфічнымі тэрмінамі, якія ён сустрэне ў кнізе і такім чынам да другой главы – "Древняя история Кричевского района и памятники археологии" – чытач падыходзіць больш-менш падрыхтаваным.

Другая глава пачынаецца з кароткага нарыса даследаванняў помнікаў археалогіі Крычаўшчыны, прычым трэба адзначыць, што аўтар на некалькіх старонках коратка, але аб'ектыўна паказвае ўклад у гэтую справу кожнага даследчыка пачынаючы з XIX ст.

Апавядаючы аб першых кроках чалавека на тэрыторыі сучаснага Крычаўскага раёна, аўтар не толькі дае нам месцазнаходжанне артэфактаў той ці іншай археалагічнай эпохі, але і тлумачыць, чым яна характэрызавалася, які тып гаспадаркі вялі людзі ў гэты перыяд, якія найбольш значныя адкрыцці адбыліся ў гэты час. Аўтар знаёміць чытача з грамадскім ладам, які быў у жыхароў таго часу, з тымі абставінамі, якія спрыялі пераменам у ім. Ужо ў гэтым плане манаграфія В.Ф.Капыціна выходзіць за межы звычайнага каталага помнікаў археалогіі, а фактычна з'яўляеца добрым метадычным дапаможнікам для настаўнікаў гісторыіі і вучняў сярэдніх школ Крычаўшчыны.

Аднак у гэтай частцы ёсць і пэўныя памылкі, якія выкліканы, перш за ўсё, слабым археалагічным вывучэннем усходніх раёнаў Магілёўшчыны. Так, аўтар сцвярджае, што ў эпоху ранняга жалезнага веку гэтыя землі засялялі плямёны міларадскай археалагічнай культуры (VIII – II стст. да н.э.), культуры штрыхавой керамікі (VIII ст. да н.э. – V ст.н.э.), якую змянілі насельнікі зарубінецкай культуры (II ст.да н.э. – I ст.н.э.) і кіеўскай культуры (II – V ст.н.э.).

У выніку новых даследаванняў помнікаў археалогіі жалезнага веку на тэрыторыі Крычаўскага раёна стала зразумелым, што ў эпоху ранняга жалезнага веку (V ст. да н.э. – II ст, н.э.) гэтыя землі насялялі плямёны днепра-дзвінскай археалагічнай культуры – гарадзішчы Волчас, Ягораўка, Гарадзец у Крычаве з'яўляюцца

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

паўднёвымі кропкамі гэтай археалагічнай культуры. На поўдзень ад іх, за Сожам, пачыналася тэрыторыя, якую насялялі носьбіты другой археалагічнай культуры ранняга жалезнага веку – юхнаўскай, і таму на днепра-дзвінскіх помніках Крычаўшчыны добра прасочваецца юхнаўскі ўплыў.

У II ст. н..э. на змену днепра-дзінскім плямёнам сюды прыходзіць насельніцтва тыпу сярэдняга слоя гарадзішча Тушамля, якое жыло тут да V ст.н.э. Таксама памыляецца аўтар, калі сцвярджае, што ў V – VIII ст.н.э. землі сучаснага Крычаўскага раёна насялялі плямёны банцараўскай культуры. На самой справе тут жылі носьбіты тушамлянскай культуры, якая па сваіх характэрных рысах хаця і з'яўляецца даволі блізкай банцараўскай культуры, але большасць даследчыкаў лічыць яе самастойнай археалагічнай культурай.

Наступны раздзел манаграфіі складае рэестр помнікаў археалогіі Крычаўскага раёна. Гэта частка зроблена грунтоўна і чытач знаходзіць тут любую інфармацыю якая тычыцца таго ці іншага помніка. Аўтар апісвае не толькі сучасны стан помніка, але дае кароткія звесткі аб яго стане ў папярэднія часы, даследчыках помніка і аб выніках даследавання. Тут жа чытач знаходзіць сітуацыйны план помніка ў масштабе 1:200 000, што дапамагае ў яго пошуках, і спіс прац, у якіх помнік згадваецца, альбо надрукаваны вынікі яго даследаванняў. Апісанне помнікаў аўтар дае з улікам сённяшняга адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзела раёна – па сельсаветах, што таксама робіць нецяжкім пошук інфармацыі аб помніку.

У манаграфіі такога плана – каталазе, вельмі карысным з'яўляецца асобны спіс выкарыстаных прац і геаграфічны паказчык, які аблягчае пошук інфармацыі аб помніку. Завяршае манаграфію карта археалагічных помнікаў Крычаўскага раёна і планы кожнага помніка археалогіі. Апошнія выклікаюць асаблівую каштоўнасць, бо фактычна зроблены ўпершыню і даюць наглядна ўяўленне аб месцаразмяшчэнні помніка.

Чарговая манаграфія В.Ф.Капыціна, прысвечаная помнікам археалогіі Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці, з'яўляецца вельмі каштоўным і карысным выданнем, якое накіравана на захаванне гістарычнай спадчыны. Тую вялікую працу, якую праводзіць В.Ф.Капыцін, трэба ўсяляк падтрымліваць і вітаць.

А.А. МЯЦЕЛЬСКІ

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова